## ЭТНАПЕДАГАГІЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ БЕЛАРУСАЎ У ТВОРЧАСЦІ У. С. КАРАТКЕВІЧА

***Трушко І. А.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– І. С. Сычова, канд. пед. навук, дацэнт*

Неабходнасць выхавання моладзі на аснове традыцыйных для беларусаў каштоўнасцей, паглыблення нацыянальна-рэгіянальнага кампаненту зместу адукацыі, захавання самабытнасці выхаваўчага працэсу, абумоўліваюць актуальнасць асэнсавання творчасці У.С. Караткевіча як педагагічнай з'явы. Яго творы фарміруюць светапогляд чытача, дапамагаюць моладзі асэнсоўваць сябе як прадстаўнікоў менавіта беларускага этнасу.

*Патрыятычнае выхаванне* (вершы "Машэка", "Балада пра паўстанне Ваўкалака", "Заяц варыць піва", "Матчына душа", "Паўлюк Багрым", аповесці "Цыганскі кароль", "Дзікае паляванне караля Стаха", драма "Кастусь Каліноўскі" і інш.) рэалізуецца з дапамогай такіх сродкаў, як народная творчасць, падзеі айчыннай гісторыі.

*Гуманістычнае і разумовае выхаванне* ("Балада пра смяротнікаў", паэма "Бацькава сэрца", зборнік вершаў "Мая Іліяда" і інш.) адбываецца праз асэнсаванне скарбаў агульначалавечай культуры, глыбокае раскрыццё сутнасці чалавечых узаемаадносін.

*Мастацкае і эстэтычнае выхаванне* (вершы "Дзіва на Нерлі", "Прарок Геронім Босх", "Самсон", раман "Чорны замак Альшанскі" і інш.) скіравана на знаёмства з сусветна вядомымі творамі жывапісу, музыкі, дойлідства, што паглыбляе найперш цікавасць да беларускай культуры.



МГПУ им. И.П.Шамякина

*Духоўнае і маральнае выхаванне* (верш “Трызненне мужыцкага Брэйгеля”, “Балада аб трыццаць першым сярэбраніку”, раман “Хрыстос прызямліўся ў Гародні”, апавяданні “Блакіт і золата дня”, “Лятучы Галандзец”, аповесць “Сівая легенда” і інш.) фарміруе асобу чытача шляхам прадастаўлення выбару, знаёмячы як з народнай, так і з афіцыйнай сістэмай маральных каштоўнасцей.

*Сямейнае і працоўнае выхаванне* (раман “Каласы пад сярпом тваім”, паэмы “Бацькава сэрца”, “Слова пра чалавечнасць” і інш.) пазбаўлена аднабаковасці, паколькі пісьменнік адлюстроўвае сямейных і грамадскіх ўзаемаадносін прадстаўнікоў розных сацыяльных груп: сялянства, мяшчан, шляхты, магнатаў.

Выхаваўчы патэнцыял творчасці пісьменніка рэалізуецца пры выкладанні беларускай мовы і літаратуры, вывучэнні гісторыі Беларусі, у пазакласнай вучэбна-выхаваўчай рабоце.

**Літаратура**

1. Караткевіч, У. С. Збор твораў: у 8 т. Вершы, паэмы /У. С. Караткевіч. – Мінск: Маст. літ.: 1987 – 1991. – Т. 1 – 8.

МГПУ им. И.П.Шамякина